# ПАЛЯКІ ПРА БЕЛАРУСЬ

Варшава, 2023

Рапарт даследавання грамадскай думкі
для Цэнтра дыялогу імя Юльюша Мерашэўскага

# І БЕЛАРУСАЎ



# ПАЛЯКІ ПРА БЕЛАРУСЬ І БЕЛАРУСАЎ

Рапарт даследавання грамадскай думкі
для Цэнтра дыялогу імя Юльюша Мерашэўскага

Варшава, 2023
Цэнтр дыялогу імя Юльюша Мерашэўскага

**Апытанне**
ARC Rynek i Opinia

**Аналіз і рапарт**
Лукаш Мазуркевіч, Гжэгаж Сыгноўскі

**Уступ**
Эрнэст Выцішкевіч

**Copyright by**
Centrum Dialogu im. Juliusza Mieroszewskiego

**Дызайн і вёрстка**
dobosz.studio

**ISBN**
978-83-66883-48-2

**Выдавец**
Цэнтр дыялогу імя Юльюша Мерашэўскага
вул. Ясна 14/16А, 00-041 Варшава
тэл.+ 48 22 295 00 30
e-mail: kontakt@mieroszewski.pl
**www.mieroszewski.pl**

# Змест:


| | | |
|---|---|---|
| 1. | Уступ | 6 |
| 2. | Уводзіны – фон і мэта даследавання | 8 |
| 3. | Інфармацыя пра даследаванне | 10 |
| **4.** | **Ацэнка стаўлення да Польшчы выбраных дзяржаў і народаў** | **14** |
| **5.** | **Вобраз Беларусі** | **18** |
| **6.** | **Ацэнка беларускіх уладаў і іх палітыкі** | **25** |
| **7.** | **Польска-беларускія адносіны** | **30** |
| 8. | Падсумаванне | 38 |

# 1. Уступ

Запрашаем вас пазнаёміцца з вынікамі і аналізам найноўшага даследавання польскай грамадскай думкі, праведзенага ў траўні 2023 года па замове Цэнтра дыялогу імя Юльюша Мерашэўскага. Апытанне "Палякі пра Беларусь і беларусаў" з'яўляецца працягам распачатага ў 2022 годзе новага цыклу рапартаў, мэта якіх – дапамагчы ў лепшым разуменні ўзаемнага ўспрымання палякаў і народаў Усходняй Еўропы.

Апошнія гады насычаныя падзеямі, якія карэнным чынам змянілі сацыяльныя, палітычныя і эканамічныя ўмовы ў нашым рэгіёне. Летась на гэтыя змены мы адказалі рапартамі пра ўспрыманне ўкраінцамі Польшчы, палякаў і польскай культуры, жадаючы зафіксаваць глыбокія і пазітыўныя змены ва ўспрыманні нашай краіны суседам, што змагаецца з расійскай агрэсіяй.

Вайна непазбежна адсунула ў цень важныя праблемы, звязаныя з Беларуссю: масавыя мірныя пратэсты, следам за якімі разгарнуліся масавыя жорсткія рэпрэсіі супраць тых, хто ўдзельнічаў у любых спробах супрацьстаяць рэжыму. Змена не адбылася, тысячы беларусаў прайшлі праз турмы, дзясяткі тысячаў былі вымушаныя пакінуць краіну. За мяжой адбылася кансалідацыя апазіцыі і стварэнне вакол надзеленай дэмакратычным мандатам Святланы Ціханоўскай падмуркаў урада ў выгнанні. Аднак пяць хвілін Беларусі на міжнароднай арэне скончыліся з пачаткам расійскага ўварвання ва Украіну, у якім беларуская дзяржава прыняла актыўны ўдзел, забяспечыўшы доступ да сваёй тэрыторыі для наземнага наступу, а потым для рэгулярных абстрэлаў і бамбардаванняў украінскіх гарадоў і аб'ектаў інфраструктуры.

У 2020–2021 гадах Польшча стала адным з найважнейшых прытулкаў для беларускіх актывістаў, дзеячаў культуры і прадпрымальнікаў. Супраціў беларускага грамадства дыктатуры Лукашэнкі выклікаў вельмі пазітыўны рэзананс у польскім грамадстве, разбурыўшы шматлікія стэрэатыпы пра беларусаў, якія нібыта змірыліся з лёсам і няздольныя да масавага ўздыму ў імя абароны асноўных правоў і свабодаў. Разам з тым брутальнасць расійскай агрэсіі, у якой таксама ўдзельнічала Беларусь, выклікала масавае абурэнне, вектар якога быў і ёсць накіраваны, у першую чаргу, на расіянаў, не абышло і беларусаў. Назіраючы за сутыкненнем гэтых працэсаў – узрастаннем сімпатыі і павагі, супраціву і абурэння – мы палічылі мэтазгодным больш падрабязна вывучыць, як цяпер палякі глядзяць на Беларусь і беларусаў, як развіваецца іх стаўленне, якую ролю ў гэтым працэсе граюць згаданыя палітычныя падзеі. Адначасова мы правялі даследаванне сярод беларусаў у Польшчы, каб зразумець іх стаўленне да Польшчы і палякаў. Вынікі будуць неўзабаве прадстаўлены ў наступным рапарце.

Запрашаючы вас азнаёміцца з падрабязным аглядам вынікаў апытання, якія вы знойдзеце ў адпаведным раздзеле рапарту, мы хацелі б спыніцца на некалькіх тэмах.

Відаць выразна, што Расія – гэта "камень на шыі" беларусаў, калі гаворка ідзе пра ўплыў на іх успрыманне ў Польшчы. Значны рост непрыязнасці і недаверу да іх, здаецца, шмат у чым абумоўлены дзеяннямі Расіі, у прыватнасці, уцягваннем Мінска ў вайну і паглыбленнем падпарадкавання беларускага рэжыму мэтам расійскай палітыкі. Акрамя таго, пазітыўны вобраз беларускага грамадства пасля пратэстаў 2020 года быў выцеснены негатыўнымі асацыяцыямі, звязанымі з ростам рэпрэсіўнасці, агрэсіўнасці і прарасійскасці рэжыму Лукашэнкі. Немалаважная тут таксама сувязь паміж пазітыўным успрыманнем і дасягнутым поспехам ці, прынамсі, узроўнем рашучасці ў імкненні да яго. Параза беларускай апазіцыі выклікала спачуванне і рэфлекс салідарнасці, але яна не можа быць устойлівым чыннікам у фарміраванні станоўчага стаўлення.

Вядома, зусім не дзіва, што дзейны беларускі дыктатар Аляксандр Лукашэнка відавочна займае першае месца ў рэйтынгу пазнавальнасці: пераважная большасць рэспандэнтаў успрымае яго крытычна, галоўным чынам, праз метады ажыццяўлення ўлады і спадарожныя ім рэпрэсіі, але таксама праз залежнасць ад Расіі і саўдзел у вайне. Характэрна, што амаль 40% апытаных ведаюць, хто такія Святлана Ціханоўская, Анджэй Пачобут або Анжаліка Борыс. Аднак дыспрапорцыі, заўважаныя паміж рознымі ўзроставымі групамі ў гэтым пытанні, паказваюць на тое, што, магчыма, Беларусь знікае з ментальнай мапы многіх маладых палякаў.

У пытанні пазнавальнасці характэрна рашучая перавага палітыкаў або ўцягненых у палітыку асобаў над дзеячамі культуры, што паказвае, наколькі палітызавана польскае ўспрыманне суседа, верагодна, выкліканае таксама прысутнасцю менавіта гэтых

асобаў у СМІ. Гэтыя назіранні, аднак, павінны даць выразны сігнал як беларускай дыяспары ў Польшчы, так і польскім уладам — патрэбныя супольныя і самастойныя ініцыятывы, скіраваныя на павышэнне ўзроўню пазнавальнасці беларускай культуры, як сучаснай, так і старажытнай. Важным інструментам маглі б стаць польска-літоўска-беларускія праграмы, якія нагадвалі б пра агульную гісторыю і спадчыну; гэта можа наноў гістарычна ўкараніць суседа ў польскай ментальнасці, паслядоўна выкараняючы савецкія асацыяцыі.

Улічваючы ўплыў вайны, цешыць, што сярод палякаў захоўваецца высокі ўзровень падтрымкі актыўнай дапамогі Беларусі ў барацьбе з рэжымам і перакананне, што ў доўгатэрміновай перспектыве Польшча зацікаўленая ў дэмакратычнай і вольнай Беларусі. Беларускія справы, хоць і азмрочаныя расійскай агрэсіяй, па-ранейшаму даволі жыва цікавяць палякаў, 1/3 з якіх прызнаецца, што рэгулярна сочыць за інфармацыяй пра суседа.

Апытанне таксама пацвярджае — і гэта хутчэй не будзе нечаканасцю для аналітыкаў польскай палітыкі на Усходзе — што ў Польшчы пераважае пазіцыя салідарнасці з беларусамі. 43% палякаў хацелі б падтрымкі прынамсі для тых беларускіх грамадзянаў, якія знайшлі ў Польшчы прытулак ад палітычных рэпрэсій, а 30% наогул хацелі б даць беларусам правы, належныя, галоўным чынам, грамадзянам ЕС. Пры гэтым адзначаецца, што пэўная частка палякаў — усяго 20% — не лічыць беларускіх палякаў суайчыннікамі або сумняваецца ў такім вызначэнні. Яшчэ больш польскіх грамадзянаў (40%) неахвотна ставяцца да прывілеяў, якімі беларускія палякі карыстаюцца ў Польшчы на падставе Карты паляка, або сумняваюцца ў тым, ці павінны яны імі валодаць.

Пазнавальнасць сярод палякаў асобаў з Беларусі і сямейныя сувязі таксама з'яўляюцца значным фактарам, які стварае істотны патэнцыял для выкарыстання ў рэкамендаванай дзейнасці. Нягледзячы на рост недаверу, па-ранейшаму пераважае перакананне ў неабходнасці праяўлення салідарнасці з рэпрэсаванымі, але таксама ў агульнай падтрымцы беларусаў у Польшчы.

Варта адзначыць праблему, не разгледжаную ў даследаванні, а менавіта няпростыя адносіны паміж сацыяльна і палітычна актыўнымі беларусамі і ўкраінцамі ў Польшчы. У нашых даследаваннях, праведзеных напрыканцы 2020 года, амаль 70% рэспандэнтаў заявілі, што польскі бок зацікаўлены ў падтрымцы незалежнасці Украіны і Беларусі і збліжэнні гэтых краін з ЕС. Сёння, верагодна, аб'яднанне дзвюх дзяржаў у адным пытанні было б расцэнена як злоўжыванне. У святле глыбокіх і пазітыўных змен, што адбываюцца ў польска-ўкраінскіх сацыяльных адносінах, было б важна ўсталёўваць адносіны паміж беларускай дыяспарай і ўкраінскімі асяроддзямі для паступовага аднаўлення даверу. Вялікая нагрузка, нягледзячы на меншую колькасць і ўплыў, ляжыць тут на беларусах у Польшчы. Пазітыўнае фарміраванне ўспрымання Беларусі і беларусаў нельга разглядаць у адрыве ад больш шырокіх сацыяльна-палітычных працэсаў, якія адбываюцца ў рэгіёне пад уплывам вайны. Стратэгія "перачакаць крызіс" не прынясе вынікаў. Калі беларусы маюць намер адмежавацца ад негатыўнага ўплыву дзеянняў рэжыму Лукашэнкі на іх успрыманне, то дыяспара павінна ўзмацніць сваю актыўнасць у публічнай сферы. Не толькі разлічваць на падтрымку, якая, зрэшты, па-ранейшаму аказваецца, але і ўключыцца ў фарміраванне павесткі. Вядома, сёння рабіць гэта складаней, чым два гады таму, праз удзел Беларусі ў расійскай агрэсіі і пагаршэнне ўспрымання беларусаў, але, як гэта ні парадаксальна, гэтыя абставіны могуць таксама дапамагчы надзеленай мандатам апазіцыйнай эліце ў здзяйсненні і абгрунтаванні адназначнага цывілізацыйнага выбару, у адмове ад звычкі лавіраваць і шукаць уяўную раўнавагу паміж Усходам і Захадам.

**Эрнэст Выцішкевіч**

## 2. Уводзіны – фон і мэта даследавання

Найперш падзеі, звязаныя з фальсіфікацыяй прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі ў 2020 годзе і рэпрэсіі супраць беларускага грамадства і супраць палякаў у Беларусі, потым гэтак званы іміграцыйны крызіс, выкліканы рэжымам Аляксандра Лукашэнкі на мяжы з Польшчай, і, урэшце, стаўленне ўладаў і беларускага грамадства да расійскай агрэсіі ва Украіне – гэтыя тры кантэксты ў значнай ступені фарміруюць павестку польскіх дыскусій на беларускую тэматыку, забяспечваючы яе пастаянную прысутнасць у медыя-прасторы. Можна сказаць, што Беларусь – побач з Украінай – ужо некалькі гадоў знаходзіцца ў цэнтры ўвагі польскіх СМІ і польскай грамадскай думкі.

Дынаміка падзей вакол Беларусі выбіла палякаў з пэўнага сталага пункту гледжання на гэтую краіну. Цягам трох дзесяцігоддзяў гэта быў даволі ўстойлівы вобраз, які не выклікаў у польскіх дыскусіях нейкіх моцных эмоцый. Нязменнасць кіруючага рэжыму, вобраз беларусаў як людзей спакойных, менш схільных да пратэстаў, своеасаблівая "малая стабілізацыя" ў адносінах з Беларуссю – усё гэта змянілася і працягвае імкліва змяняцца. Тэхнічная загарода, узведзеная на польска-беларускай мяжы, – надзвычай выразны, новы сімвал той сітуацыі, у якой мы цяпер знаходзімся ў адносінах з гэтым усходнім суседам Польшчы.

Менавіта таму так важна правільна адрозніць і зразумець узаемнае ўспрыманне двух народаў і ўхапіць працэс крышталізацыі беларускай ідэнтычнасці перад абліччам падзей, якія непасрэдна пагражаюць суверэнітэту гэтай краіны. Гэта неабходныя ўмовы для планавання як палітыкі на дзяржаўным узроўні, так і дзейнасці ў сацыяльнай і культурнай сферах. Сфарміраваныя ў мінулым уяўленні аб нашым усходнім суседзе сёння патрабуюць тэрміновага і глыбокага перагляду.

Менавіта ў такім кантэксце па замове Цэнтра дыялогу імя Юльюша Мерашэўскага было праведзена апытанне польскай грамадскай думкі пра Беларусь і беларусаў. Яго мэтай было, сярод іншага, вызначэнне:

- як на фоне да бягучых падзей фарміруецца ўспрыманне Беларусі, яе ўладаў і жыхароў?
- як сталая адкрытасць грамадскай думкі да навінаў з Беларусі паўплывала на цікавасць да гэтай краіны і веды пра яе?
- якія чаканні маюць палякі адносна палітыкі ў дачыненні да Беларусі, якую цяпер павінна весці Польшча і іншыя краіны Захаду?
- ці трэба і, калі трэба, то як, падтрымліваць беларускае грамадства, у тым ліку палякаў у Беларусі?
- якую стратэгію абраць у стаўленні да беларусаў, якія шукаюць у Польшчы ўмоваў для лепшага жыцця?

Гэта найважнейшыя пытанні, узнятыя ў даследаванні, вынікі якога ўключаны ў прадстаўлены рапарт. Ён з'яўляецца часткай больш шырокага даследчага праекта па беларускай тэматыцы, што ў цяперашні час праводзіць Цэнтр дыялогу імя Юльюша Мерашэўскага. Паралельна было праведзена апытанне сярод беларусаў у Польшчы, прысвечанае іх меркаванню аб бягучых падзеях, аб знаходжанні ў Польшчы і звязаных з гэтым планах.

Абодва даследаванні дазваляюць выявіць сацыяльны патэнцыял польска-беларускіх адносінаў, якія ўступілі ў абсалютна новую фазу. Гэта стварае сапраўдныя выклікі для многіх польскіх устаноў і асяроддзяў, што займаюцца Усходняй Еўропай.

*[...] так важна правільна адрозніць і зразумець узаемнае ўспрыманне двух народаў і ўхапіць працэс крышталізацыі беларускай ідэнтычнасці перад абліччам падзей, якія непасрэдна пагражаюць суверэнітэту гэтай краіны.*

# 3. Інфармацыя пра даследаванне

## Метадалогія

ПАМЕР ВЫБАРКІ **1002** РЭСПАНДЭНТЫ

**Метад правядзення апытання:**
Даследаванне насіла характар колькаснага вымярэння, праведзенага з дапамогай камп’ютарнай сістэмы тэлефоннага інтэрв’ю (CATI).

**Рэспандэнты і геаграфія:**
Апытанне было праведзена на выбарцы з 1002 дарослых палякаў, рэпрэзентатыўных з гледзішча структуры польскага насельніцтва, а менавіта з гледзішча полу, узросту, велічыні месца жыхарства і ваяводства.

**Вымярэнне праводзілася:**
з 10.05 па 19.05.2023.

**Дадатковая інфармацыя:**
На частцы графікаў дадзеныя не складаюцца ў 100%. Такая сітуацыя ўзнікае ў выпадку пытанняў з некалькімі магчымымі адказамі. Для пытанняў з адным магчымым адказам мінімальныя адхіленні ад 100% звязаны з акругленнем адсоткаў.

## Структура выбаркі

↓ ГРАФІК 1:

### Пол




↓ ГРАФІК 2:

### Узрост

| | |
|---|---|
| 18–24 | 15% |
| 25–34 | 19% |
| 35–44 | 16% |
| 45–54 | 20% |
| 55–64 | 13% |
| 65+ | 17% |

↓ ГРАФІК 3:

### Адукацыя

| | |
|---|---|
| Пачатковая | 10% |
| Сярэдне-спецыяльная | 31% |
| Сярэдняя | 35% |
| Вышэйшая | 24% |

↓ ГРАФІК 4:

## *Ваяводства*

| | |
|---|---|
| Ніжнесілезскае | 8% |
| Куяўска-Паморскае | 5% |
| Люблінскае | 6% |
| Любушскае | 3% |
| Лодзінскае | 7% |
| Малапольскае | 9% |
| Мазавецкае | 12% |
| Апольскае | 3% |
| Падкарпацкае | 6% |
| Падляскае | 3% |
| Паморскае | 6% |
| Сілезскае | 12% |
| Свентакшыскае | 3% |
| Вармінска-Мазурскае | 4% |
| Велікапольскае | 9% |
| Заходнепаморскае | 4% |

ГРАФІК 5:

## *Памер населенага пункта*

- Вёска — 38%
- Горад да 20 тыс. жыхароў — 13%
- Горад 20–49 тыс. жыхароў — 11%
- Горад 50–99 тыс. жыхароў — 9%
- Горад 100–199 тыс. жыхароў — 8%
- Горад 200–499 тыс. жыхароў — 9%
- Горад 500 тыс. і больш жыхароў — 12%

4

# Ацэнка стаўлення да Польшчы выбраных дзяржаў і народаў

Аналіз адказаў на пытанні пра тое, як палякі ўспрымаюць суседнія краіны і якое стаўленне да Польшчы яны ім прыпісваюць, паказвае, які ўплыў на гэтае ўспрыманне пакідае вайна ва Украіне. Гэты ўплыў бачны яшчэ больш выразна, калі параўнаць бягучыя вынікі з дадзенымі даследаванняў, атрыманымі да вайны[1] .

*Яшчэ тры гады таму адказы аб непрыязным стаўленні да Польшчы пераважалі ў выпадку з Расіяй. Цяпер да гэтай групы далучылася і Беларусь.*

Гэта найважнейшае, фундаментальнае заключэнне прадстаўленага тут даследавання. Толькі **10%** апытаных лічаць стаўленне Беларусі да Польшчы прыязным, **82%** лічаць яго непрыязным. Гэта сапраўдны крах ранейшага ўспрыняцця краіны сярод палякаў. Тры апошнія гады, і гэта зразумела, прынеслі пагаршэнне ўспрыняцця польска-расійскіх адносінаў, але тая змена, што ў гэты ж час адбылася ў беларуска-польскіх адносінах асабліва заўважная.

Гэта не дзіўна, бо прынамсі ў афіцыйным дыскурсе Беларусь плячо да пляча стае на бок агрэсара і тэрыторыя Беларусі выкарыстоўваецца расіянамі для нападаў на Украіну.

Апошнія гады прынеслі ўмацаванне ўспрыняцця польскай грамадскасцю такіх краін, як Славакія, Чэхія і Германія. У выпадку з Германіяй не змянілася пэўная дыстанцыя, з якой палякі падыходзяць да нямецка-польскіх адносінаў. Улічваючы ўсіх іншых нашых суседзяў (вядома, акрамя Расіі і Беларусі), успрыняцце стаўлення Германіі да Польшчы адносна найменш прыязнае, хоць, вядома, перавага станоўчых адказаў усё яшчэ вельмі выразная.

У выпадку з Літвой успрыняцце стаўлення гэтай краіны да Польшчы ў апошнія гады больш схілілася да прыязных адносінаў. Такая ж з'ява, нават у большай выражанай ступені, зафіксаваная ў дачыненні да Украіны. У цяперашні час **80%** апытаных лічаць, што Украіна прыязна ставіцца да Польшчы, што значыць павелічэнне на 17 працэнтных пунктаў. Супрацьлеглага меркавання (непрыязнае стаўленне да Польшчы) прытрымліваюцца **11%** апытаных (зніжэнне на 8 працэнтных пунктаў).

---

1 Даследаванне з серыі "Польшча–Расія. Сацыялагічны дыягназ", праведзенае ў 2020 годзе па замове Цэнтра польска-расійскага дыялогу і паразумення.

↓ ГРАФІК 6:

## *Як палякі ўспрымаюць стаўленне іншых дзяржаў да Польшчы?*



Калі ў дачыненні да Беларусі як дзяржавы палякі хутчэй згодныя з тым, што яна варожа ставіцца да Польшчы, то ўжо ў дачыненні да беларусаў як народу ацэнкі апытаных не такія адназначныя. Што праўда, доля прыхільнікаў тэзіса аб тым, што беларусы як народ прыязна ставяцца да Польшчы, цяпер не такая высокая, як гэта было ў 2020 годзе, але такое перакананне па-ранейшаму падзяляе трэць апытаных. Прыкладна кожны другі апытаны лічыць інакш – што беларусы незычліва ставяцца да Польшчы.

Менш катэгарычнай пазіцыі апытаныя прытрымліваюцца ў адносінах да расіянаў як да народа – тут, аднак, перавага адзнак з адмоўнай афарбоўкай над станоўчымі ўжо прыкметна вышэйшая.

Агрэсія Расіі ва Украіне таксама прывяла да зменаў ва ўспрыманні ў Польшчы літоўцаў і ўкраінцаў. У адным і другім выпадку павялічылася колькасць асобаў, якія ўспрымаюць стаўленне гэтых народаў да Польшчы як прыязнае, пры адначасовым памяншэнні ўказанняў варыянта “непрыязнае стаўленне”. Аналагічная з’ява была адзначана ў дачыненні да немцаў, хоць тут гэтыя змены знаходзяцца на мяжы статыстычнай хібнасці.

↓ ГРАФІК 7:

## *Як палякі ўспрымаюць стаўленне іншых народаў да Польшчы?*



5

# Вобраз Беларусі

Змена ў тым, як палякі бачаць стаўленне Беларусі і беларусаў да Польшчы, безумоўна, мае значэнне для вобразу Беларусі і асацыяцый з гэтай краінай, што функцыянуюць у грамадскай свядомасці.

*На пытанне аб асацыяцыях са словам “Беларусь” рэспандэнты ў пераважнай большасці сфармулявалі выказванні негатыўнай афарбоўкі.*

Толькі асобныя людзі імкнуліся ўбачыць у гэтым кантэксце нейкія пазітыў, падкрэсліваючы, перш за ўсё, грамадскія каштоўнасці (грамадзянская супольнасць, апазіцыя і г.д.).

Першыя дзве найбольш часта фармуляваныя асацыяцыі звязаны з аўтарытарным кіраваннем і наўпрост з Аляксандрам Лукашэнкам (разам **42%**). Яшчэ адна найбольш частая асацыяцыя тычылася вайны і ўдзелу Беларусі ў агрэсіі Расіі ва Украіне (разам **19%**).

Сярод спантанных асацыяцый былі і падзеі з польска-беларускай мяжы, а дакладней, іміграцыйны крызіс, які рэжым Лукашэнкі распальваў яшчэ да пачатку вайны ва Украіне.

↓ ГРАФІК 8:

## *Спантанныя асацыяцыі са словам “Беларусь”*

- Таталітарызм, аўтарытарная ўлада — 22%
- Лукашэнка — 20%
- Супрацоўніцтва (залежнасць) з Расіяй — 14%
- Варожае стаўленне да Польшчы — 7%
- Іншыя негатыўныя эмоцыі — 6%
- Падзеі на мяжы — 6%
- Вайна — 5%
- Сусед Польшчы — 3%
- Пазітыўная ацэнка народа, не ўлады — 3%
- Не ведаю — 18%



Спантанныя асацыяцыі
са словам “Беларусь”

***Таталітарызм, аўтарытарная ўлада, Лукашэнка***

# 42 %



Акрамя спантанных асацыяцый з Беларуссю, вобраз Беларусі сярод палякаў быў даследаваны ў пяці наступных вымярэннях:

- сучасная – адсталая
- багатая – бедная
- дэмакратычная – недэмакратычная
- выклікае давер – не выклікае даверу
- варта наведаць – не варта наведваць

Заданнем кожнага рэспандэнта было ацаніць па пяцібальнай шкале сваё ўспрыманне Беларусі на кожным з гэтых пяці вымярэнняў.

Выявілася, што на аніводным з вымярэнняў сярэдні вынік ацэнак не перакрочыў сярэдзіну шкалы, то-бок 3 пункты. Найбліжэй да гэтага выніку апытаныя былі, ацэньваючы Беларусь з гледзішча турыстычнага патэнцыялу: “варта наведаць”.

Найгоршыя вынікі назіраліся ў ацэнцы даверу і якасці дэмакратыі ў гэтай краіне. У адным і ў другім выпадку пераважная большасць апытаных ацаніла Беларусь як недэмакратычную краіну, што не выклікае даверу.

ГРАФІК 9:

## *Як палякі ўспрымаюць Беларусь?*

*(сярэдні вынік на шкале ад 1 да 5)*



Уяўленні пра Беларусь і вобраз гэтай краіны, якія функцыянуе сярод палякаў, могуць залежаць ад крыніц інфармацыі.

*Выяўляецца, што даволі шмат палякаў (**29%**) ведаюць асабіста нейкага беларуса ці беларуску,*

акрамя таго, **9%** маюць сяброў/знаёмых у Беларусі. Таму некаторыя рэспандэнты маюць інфармацыю пра Беларусь як бы з першых рук.

Апытаныя, якія асабіста ведаюць беларусаў або маюць у Беларусі сям'ю ці знаёмых, відавочна часцей за іншых апытаных паказваюць, што беларусы як народ прыязна ставяцца да Польшчы. Такія людзі таксама праяўляюць да беларусаў большую эмпатыю і, сярод іншага, не так хутка вінавацяць саміх беларусаў у сітуацыі, у якой яны апынуліся (менш пазначэнняў варыянту "самі выбралі сабе такога прэзідэнта").

Нямногія палякі заяўляюць пра сваё наведванне Беларусі цягам апошніх гадоў. Разам з тым траціна апытаных сцвярджае, што рэгулярна сочыць за інфармацыяй на тэму Беларусі, што варта лічыць высокім адсоткам.

↓ ГРАФІК 10:

## *Асабісты досвед з Беларуссю і беларусамі*

- Вы рэгулярна сочыце за інфармацыяй на тэму Беларусі, беларускага грамадства і культуры — **32%**
- Вы асабіста ведаеце нейкага беларуса/беларуску — **29%**
- Вы маеце ў Беларусі сяброў/знаёмых — **9%**
- Вам здараецца наведваць у Польшчы культурныя мерапрыемствы і акцыі, звязаныя з Беларуссю — **5%**
- Вы бывалі ў Беларусі цягам апошніх 10 гадоў, наведваючы родных/знаёмых — **5%**
- Вы маеце ў Беларусі родных/сваякоў — **4%**
- Вы бывалі ў Беларусі цягам апошніх 10 гадоў па працы/справах — **1%**



Падзеі ў Беларусі 2020 года асацыююцца ў палякаў, перш за ўсё, з фальсіфікаванымі прэзідэнцкімі выбарамі і масавымі грамадскімі пратэстамі, якія былі жорстка падаўлены ўладамі.

> *Менавіта маштабны грамадскі супраціў у форме дэманстрацый і пратэстаў беларускага грамадства мацней за ўсё ўкараніўся ў свядомасці палякаў.*

Гэтая карціна была ўзмоцненая паведамленнямі пра рэпрэсіі, якія закранулі ўдзельнікаў гэтых пратэстаў. У грамадскай памяці, хоць і значна менш актыўна, таксама працягвае функцыянаваць іміграцыйны крызіс на польска-беларускай мяжы.

↓ ГРАФІК 11:

## *Падзеі 2020 года*

| | |
|---|---|
| Забастоўкі, пратэсты, дэманстрацыі | 19% |
| Фальсіфікаваныя выбары | 17% |
| Падаўленне забастовак/арышты/брутальная дэманстрацыя сілы ўладай | 9% |
| Выбары | 9% |
| Іміграцыйны крызіс, кіраванне бежанцаў на мяжу з Польшчай | 7% |
| Арышт Пачобута | 1% |
| Уцёкі Ціханоўскай | 1% |
| Не ведаю | 55% |



Заяўленая дастаткова высокая цікавасць да сітуацыі ў Беларусі пацвярджаецца арыентацыяй апытаных у асноўных акторах беларускай палітыкі і сацыяльна-культурнага жыцця. Практычна кожны паляк добра ведае, хто такі Аляксандр Лукашэнка. Прынамсі траціна апытаных, што супадае з заяўленай цікавасцю да беларускіх спраў, пазнаюць такія прозвішчы, як Ціханоўская, Пачобут, Борыс. Акрамя таго, **15%** апытаных ведаюць, хто такі Алесь Бяляцкі, а яшчэ **18%** толькі чулі гэтае прозвішча. Больш нізкай пазнавальнасцю сярод палякаў карыстаюцца такія асобы, як Павел Латушка, Святлана Алексіевіч і Зянон Пазняк.

Веданне такіх асобаў, як Анджэй Пачобут, Анжаліка Борыс, Святлана Ціханоўская, істотна залежыць ад узросту апытаных — чым старэйшыя рэспандэнты, тым большая пазнавальнасць гэтых імёнаў. Напрыклад, веданне гэтых асобаў у наймаладзейшай групе (18–24 гады) складае менш за **10%**, а ў найстарэйшай групе (55+) гэты паказнік вышэйшы нават за **60%**.

↓ ГРАФІК 12:

## *Веданне вядомых прозвішчаў, звязаных з Беларуссю*



6

# Ацэнка беларускіх уладаў і іх палітыкі

*Амаль усе палякі вельмі крытычна ставяцца да Аляксандра Лукашэнкі.*

Толькі адзінкі (3%) ацэньваюць яго станоўча. Кожны дзясяты паляк заяўляе пра нейтральнае стаўленне да Лукашэнкі.

ГРАФІК 13:

## Ацэнка Аляксандра Лукашэнкі




Негатыўнае стаўленне да Аляксандра Лукашэнкі дэтэрмінаванае, перш за ўсё, яго спосабам ажыццяўлення ўлады. Амаль кожны другі апытаны сваю негатыўную ацэнку тлумачыць адсутнасцю ў яго павагі да прынцыпаў свабоды, ужываннем тэрору і пераследам уласнага народа. У сваю чаргу, 23% указваюць на замежную палітыку Лукашэнкі, падкрэсліваючы ягоную залежнасць ад Расіі і Уладзіміра Пуціна.

ГРАФІК 14:

## Дэтэрмінанты ацэнак Лукашэнкі



На думку большасці апытаных (87%), улады Беларусі аказваюць падтрымку Расіі ў вайне супраць Украіны. Палова апытаных (53%) сцвярджае, што Беларусь аказвае палітычную падтрымку Расіі без ваеннага ўдзелу ў агрэсіі супраць Украіны, тым часам як, на думку 34% рэспандэнтаў, дапамога з боку Беларусі носіць як палітычны, так і ваенны характар. Толькі 6% апытаных лічаць, што Беларусь застаецца нейтральнай і не выступае ні на адным з бакоў. 3% лічаць, што беларускія ўлады выступаюць супраць вайны.

ГРАФІК 15:

## *Меркаваная пазіцыя ўладаў Беларусі ў дачыненні да агрэсіі Расіі ва Украіне*

- Улады Беларусі аказваюць Расіі палітычную падтрымку, але ўстрымліваюцца ад ваеннага ўдзелу ў агрэсіі супраць Украіны — 53%
- Улады Беларусі цалкам падтрымліваюць Расію ў яе вайне супраць Украіны як у палітычным, так і ў ваенным плане — 34%
- Улады Беларусі імкнуцца не стаяць ні на адным з бакоў гэтага канфлікту — 6%
- Улады Беларусі выступаюць супраць вайны — 3%
- Не ведаю/цяжка сказаць — 3%



Паводле ацэнкі апытаных, ва ўмовах расійскай агрэсіі ва Украіне беларускае грамадства ў значнай ступені інертна і пасіўна (42%), а паводле 12% рэспандэнтаў — зычліва ставіцца да Расіі. З іншага боку, даволі вялікая група апытаных (39%) лічыць, што беларускае грамадства ў асноўным выступае супраць ваенных дзеянняў, якія праводзяцца Расіяй у дачыненні да Украіны.

↓ ГРАФІК 16:

## *Меркаванне на тэму стаўлення беларускага грамадства да агрэсіі Расіі на Украіну*

- Большасць беларускага грамадства праяўляе хутчэй інертнасць і пасіўнасць да расійскай агрэсіі ва Украіне — 42%
- Беларускае грамадства ў большасці выступае супраць ваенных дзеянняў і салідарызуецца з украінцамі — 39%
- Беларускае грамадства ў большасці спрыяе агрэсіўным дзеянням Расіі супраць Украіны — 12%
- Не ведаю/цяжка сказаць — 6%



Меркаванне на тэму стаўлення беларускага грамадства да агрэсіі

***Большасць беларускага грамадства праяўляе хутчэй інертнасць і пасіўнасць да расійскай агрэсіі ва Украіне***

# 42%



7

# Польска-беларускія адносіны

Тры з чатырох апытаных негатыўна ставяцца да цяперашняга стану польска-беларускіх адносінаў. Толькі **4%** рэспандэнтаў ацэньваюць іх як добрыя або вельмі добрыя. Кожны пяты ў даследаванні ацэньвае стан польска-беларускіх адносінаў як нейтральны. Гэты вынік не здзіўляе, калі ўлічыць, як апытаныя адказвалі на пытанні аб стаўленні асобных дзяржаў і народаў да Польшчы.

↓ ГРАФІК 17:

## *Ацэнка польска-беларускіх адносінаў*



*79% апытаных згодныя са сцвярджэннем, што Польшча зацікаўленая ў тым, каб у Беларусі запанавалі свабода і дэмакратыя.*

Кожны другі рэспандэнт лічыць, што сітуацыя ў Беларусі не з'яўляецца праблемай толькі грамадзянаў гэтай краіны — на думку апытаных, польскі народ павінен дапамагаць ім гэтак жа, як заходнія краіны дапамагалі Польшчы ў часы камунізму.

Побач з такімі пазіцыямі, сфарміраванымі на глебе салідарнасці, эмпатыі або геапалітычнага мыслення, з'яўляюцца і іншыя галасы, якія або агучваюць меркаванне пра тое, што ў палякаў ёсць свае ўнутраныя праблемы, або патрабуюць большай суб'ектнасці з боку саміх беларусаў — такія галасы, аднак, належаць меншасці.

ГРАФІК 18:

## *Меркаванні пра актуальную сітуацыю ў Беларусі*



Імігранты з Беларусі ў Польшчы

*Польшча павінна аказваць падтрымку толькі тым беларусам, якія прыехалі ў Польшчу, баючыся палітычнага пераследу*



# 43 %

*Польшча павінна ў роўнай ступені падтрымліваць усіх беларусаў, якія пражываюць у нашай краіне, прапаноўваючы ім, напрыклад, доступ да рынку працы*



# 30 %

Пасля фальсіфікаваных прэзідэнцкіх выбараў 2020 года і масавых пратэстаў тысячы беларусаў былі вымушаныя пакінуць краіну праз страх пераследу. Польскія меркаванні адносна палітыкі нашай краіны ў дачыненні да беларусаў, якія знаходзяцца ў Польшчы, падзяліліся. На думку **43%** рэспандэнтаў Польшча павінна аказваць падтрымку толькі тым беларусам, якія прыехалі ў Польшчу праз страх палітычнага пераследу. **30%** апытаных лічаць, што Польшча павінна ў роўнай ступені падтрымліваць усіх беларусаў, якія пражываюць у нашай краіне, прапаноўваючы ім, напрыклад, доступ да рынку працы. Кожны чацвёрты апытаны лічыць, што грамадзяне Беларусі, якія пражываюць у Польшчы, не павінны быць прывілеяваныя ў адносінах да грамадзян іншых краін, нават калі яны апынуліся ў нашай краіне праз страх пераследу.

↓ ГРАФІК 19:

## *Імігранты і бежанцы з Беларусі ў Польшчы*



Пасля расійскага ваеннага нападу на Украіну Беларусь апынулася ўцягнутай у канфлікт на баку Расіі. На думку **46%** апытаных, Польшча і заходнія краіны павінны прыняць актыўныя меры супраць беларускага рэжыму, тым самым падтрымліваючы дэмакратычную апазіцыю.

*Кожны пяты рэспандэнт выступае за палітычную і эканамічную ізаляцыю*

*Беларусі з прычыны яе ўдзелу ў агрэсіі супраць Украіны.*

Крыху менш (**19%**) лічаць, што польскі бок павінен абмежавана супрацоўнічаць з уладамі Беларусі, каб захаваць нейкі ўплыў на падзеі ў гэтай краіне.

↓ ГРАФІК 20:

## *Чаканае стаўленне Польшчы і Захаду да Беларусі*

- Польшча/Захад павінны актыўна процідзейнічаць беларускаму рэжыму, падтрымліваючы беларускую дэмакратычную апазіцыю. Такім чынам, мы можам паскорыць звяржэнне дыктатара ўласным народам або яго асяроддзем. Дамоўленасці з ім нічога не дадуць — **46%**
- Польшча/Захад павінны палітычна і эканамічна ізаляваць Беларусь як дзяржаву, адказную за агрэсію ва Украіне і ўводзіць санкцыі — **21%**
- Польшча/Захад павінны ісці на дыялог і абмежаванае супрацоўніцтва з рэжымам, бо толькі так можна захаваць нейкі ўплыў на тое, што адбываецца там, у тым ліку дапамагчы прадстаўнікам польскай меншасці — **19%**
- Польшча/Захад павінны весці іншую палітыку ў дачыненні да непрыхільнага да вайны беларускага народа, і іншую палітыку ў дачыненні да расійскага народа, які, у большасці, падтрымлівае палітыку рэжыму — **12%**
- Не ведаю/цяжка сказаць — **2%**



У Беларусі пражывае — паводле афіцыйных дадзеных — амаль 300 тысяч людзей, якія ідэнтыфікуюць сябе як палякі. На думку большасці апытаных (**79%**), гэта нашы суайчыннікі — гэтак жа, як і палякі з самой Польшчы. Значна меншы адсотак рэспандэнтаў (**34%**) гаворыць, што беларускія палякі культурна бліжэйшыя да іншых грамадзянаў Беларусі, чым да палякаў з Польшчы. Большасць апытаных (**60%**) згодныя са сцвярджэннем, што беларускія палякі заслугоўваюць асаблівых прывілеяў у нашай краіне.

Пераважная большасць апытаных (**79%**) лічыць, што рэжым Лукашэнкі дыскрымінуе ўсіх грамадзянаў Беларусі з дэмакратычнай пазіцыяй. Аналагічны адсотак апытаных (**72%**) згодны ці хутчэй згодны са сцвярджэннем, што беларускія палякі падвяргаюцца асаблівай дыскрымінацыі з боку рэжыму Аляксандра Лукашэнкі.

Што тычыцца палітыкі Польшчы ў дачыненні да Беларусі па пытанні палякаў, якія там пражываюць, меркаванні рэспандэнтаў падзяліліся. На думку большасці апытаных (**54%**) дамоўленасці з Лукашэнкам не павінны мець месца, а **46%** згодныя з тэзісам пра тое, што ў міжнароднай палітыцы з Беларуссю клопат пра правы польскай меншасці з'яўляецца прыярытэтным пытаннем нават коштам заключэння паразуменняў з рэжымам Аляксандра Лукашэнкі.

↓ ГРАФІК 21:

## *Меркаванне палякаў на тэму беларускіх палякаў і палітыкі ў гэтай справе*




Беларускія палякі падвяргаюцца асаблівай дыскрымінацыі з боку рэжыму Аляксандра Лукашэнкі
37%
35%
18%
7%
3%
Беларускія палякі — нашы суайчыннікі
42%
37%
11%
6%
3%
Рэжым Лукашэнкі дыскрымінуе ўсіх грамадзянаў Беларусі з дэмакратычнай пазіцыяй
49%
30%
12%
6%
4%
Я цалкам згодны(ая)
Я ані згодны(ая), ані не згодны(ая)
Катэгарычна не згодны(ая)
Хутчэй згодны(ая)
Хутчэй не згодны(ая)

# 8. Падсумаванне

**Паслядоўнасць звязаных з Беларуссю падзей, распачатая крызісам вакол прэзідэнцкіх выбараў 2020 года, выклікала прыкметныя змены ва ўспрыманні Беларусі і беларусаў у свядомасці польскай грамадскай думкі. Таксама ў гэтым сэнсе наш усходні сусед зблізіўся з Расіяй – і цяпер успрымаецца падобна як краіна, кіраваная Уладзімірам Пуціным. Беларусі прыпісваюцца непрыязныя намеры ў адносінах да польскага народу і шэраг відавочна негатыўных атрыбутаў. Гэта цэласны вобраз, атрыманы праз адказы на розныя пытанні і ў розных вымярэннях ацэнак.**

Можна сказаць, што Беларусь ідзе следам Расіі і ў тым сэнсе, што яна выклікае ў польскім мысленні моцны раскол, калі гаворка ідзе пра ўспрыманне дзяржавы (яе ўладаў) і народа. Да 2014 года, г.зн. да анексіі Крыма, тое ж самае назіралася ў выпадку Расіі і расіянаў – палякі адрознівалі і асобна бачылі сістэму і простых людзей. 2014 год выявіўся пераломным у гэтым пытанні – успрыманне дзяржавы і народу зблізілася, набыло выразную негатыўную афарбоўку.

Сённяшняе бачанне Беларусі і беларусаў таксама змяшчае гэтую дыхатамію, хоць своеасаблівы “крэдыт даверу”, які даецца ў гэтым кантэксце беларускаму народу, ужо не такі вялікі, як шмат гадоў таму. Працэсы, што адбываюцца на ўсход ад польскай мяжы, маюць вялікую дынаміку і ўплываюць таксама на тэмпы зменаў у свядомасці грамадскасці. Верагодна, пад уплывам пазіцыі ўкраінцаў, якія абараняюць сваю незалежнасць, палякі падкрэсліваюць неабходнасць адпаведнай, больш актыўнай пазіцыі саміх беларусаў у пытаннях іх уласнага суверэнітэту. Атрыбут пасіўнасці, які стэрэатыпна прыпісваецца беларускаму народу, усё яшчэ гучыць у выказваннях на гэтую тэму.

Варта адзначыць высокі ўзровень зацікаўленасці і ведаў палякаў у сферы падзей, звязаных з Беларуссю. Краіна і яе жыхары ў пэўнай ступені выйшлі з ценю, з пэўнай “зоны забыцця”, занялі ў мысленні палякаў важнае, цэнтральнае месца. Лёс праціўнікаў Лукашэнкі, у тым ліку прадстаўнікоў польскай нацыянальнай меншасці ў Беларусі, моцна адгукаецца ў польскім уяўленні, асабліва чулым да такога кшталту рэпрэсій і пераследу. Геаграфічная блізкасць падзей у Беларусі (у тым ліку на польска-беларускай мяжы), культурная блізкасць беларусаў, моцная бачнасць польскай меншасці ў гэтай краіне – гэта важныя элементы, якія ўплываюць на прысутнасць беларускай тэматыкі ў Польшчы.

У гэтым кантэксце можна казаць пра вялікі грамадскі патэнцыял для адносінаў з беларускім народам. Яго ствараюць такія элементы, як адназначнае і прынцыпова негатыўнае стаўленне да рэжыму Лукашэнкі, неабходнасць падтрымкі дэмакратычных сілаў у гэтай краіне, ухваленне дапамогі беларусам, якія шукаюць у Польшчы прытулку ад пераследу. Гэта стварае кантэкст для дзеянняў як з боку польскіх уладаў, так і з боку грамадзянскай супольнасці.



У 2020—2021 гадах Польшча стала адным з найважнейшых прытулкаў для беларускіх актывістаў, дзеячаў культуры і прадпрымальнікаў. Супраціў беларускага грамадства дыктатуры Лукашэнкі выклікаў вельмі пазітыўны рэзананс у польскім грамадстве, разбурыўшы шматлікія стэрэатыпы пра беларусаў, якія нібыта змірыліся з лёсам і няздольныя да масавага ўздыму ў імя абароны асноўных правоў і свабодаў. Разам з тым брутальнасць расійскай агрэсіі, у якой таксама ўдзельнічала Беларусь, выклікала масавае абурэнне, вектар якога быў і ёсць накіраваны, у першую чаргу, нарасіянаў, не абышло і беларусаў. Назіраючы за сутыкненнем гэтых працэсаў — узрастаннем сімпатыі і павагі, супраціву і абурэння — мы палічылі мэтазгодным больш падрабязна вывучыць, як цяпер палякі глядзяць на Беларусь і беларусаў, як развіваецца іх стаўленне, якую ролю ў гэтым працэсе граюць згаданыя палітычныя падзеі.

**Centrum Mieroszewskiego**
**Mieroszewski Centre**

вул. Jasna 14/16A
00-041 Warszawa, Polska
www.mieroszewski.pl

twitter.com/MieroszewskiPL
instagram.com/MieroszewskiPL
facebook.com/MieroszewskiPL
youtube.com/c/MieroszewskiPL

Цэнтр Мерашэўскага — гэта публічная інстытуцыя, створаная ў адпаведнасці з пастановай Сейма Рэспублікі Польшча і падпарадкаваная Міністэрству культуры і нацыянальнай спадчыны Рэспублікі Польшча. Яго асноўнай мэтай з'яўляецца правядзенне, ініцыяванне і падтрымка мерапрыемстваў, скіраваных на будаванне дыялогу паміж палякамі і народамі Усходняй Еўропы, у прыватнасці з украінцамі, беларусамі, грузінамі, малдаванамі, а таксама з тымі расіянамі, якія асуджаюць злачынствы рэжыму Уладзіміра Пуціна. Юльюш Мерашэўскі — адзін з найвыбітнейшых польскіх палітычных пісьменнікаў XX ст. Ён быў прыхільнікам супрацоўніцтва палякаў з іншымі народамі, зняволенымі расійскім і савецкім імперыялізмам.